**Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай літаратуры XVII–XVIII стст.»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент<br>Модуль «Гісторыя беларускай літаратуры» |
| **Кароткі змест** | Літаратура XVII–XVIII стст. Барока, класіцызм, асветніцтва ў Беларусі. Палемічная літаратура. Сілабічная паэзія. Драматургія. Станаўленне тэатра. Школьны, прыдворны, аматарскі і народны тэатры ў Беларусі. Батлейка. Гісторыка-мемуарная проза. Летапісанне. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку паспяховага засваення дысцыпліны студэнт павінен: ***ведаць***: шляхі і галоўныя этапы развіцця нацыянальнай літаратуры (ад старажытнасці да эпохі Адраджэння); узаемасувязь светапогляду і творчасці пісьменніка, асаблівасці яго стылю; канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў; праблематыку, ідэйны змест твораў, асаблівасці кампазіцыі, вобразна-выяўленчыя сродкі; герояў твораў, іх светапоглядныя пазіцыі, рысы характару, месца ў сістэме вобразаў; звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка; ***умець***: выяўляць агульнае і адрознае ў літаратурах розных эпох; спалучаць тэарэтычныя веды з вывучэннем канкрэтных мастацкіх з’яў; упісаць літаратурны твор ў сацыякультурны кантэкст эпохі; вызначыць месца твора ў мастацкай сістэме пісьменніка і ў літаратуры свайго часу; скласці тэсты па літаратурных творах, фактах жыццёвага і творчага шляху аўтара; каменціраваць тэксты твораў, характарызуючы іх з культуралагічнага, гісторыка-бытавога, літаратуразнаўчага і іншых аспектаў; працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай; ***валодаць:*** адпаведным паняційным і літаратуразнаўчым апаратам; сучаснай метадалогіяй і методыкай літаратуразнаўчых даследаванняў; навыкамі аналізу мастацкіх твораў.<br>Патрабаванні да прафесійнай **кампетэнтнасці** спецыяліста: БПК-13. Характарызаваць асноўныя этапы станаўлення і развіцця беларускай літаратуры ў аспекце родавай і відавай прыналежнасці мастацкіх твораў, асаблівасцей іх паэтычнай і стылістычнай арганізацыі. |
| **Прэрэквізіты** | Уводзіны ў літаратуразнаўства. Вусная народная творчасць. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XVI стст. |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 108 акадэмічных гадзін, з іх 68 аўдыторных: 34 гадз. лекцый (з іх 8 КСР) і 34 гадз. практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 2 семестр, калоквіум, тэст, экзамен |